# ПАЛКОЎНІК АНАТОЛЬ ШАРКОЎ. СІМПАТЫЧНЫ, УРАЖВАЮЧЫ, УСЕБАКОВА КАМПЕТЭНТНЫ, ВЫСОКААДУКАВАНЫ, ПАСТАЯННА АНГАЖЫРАВАНЫ І З ВЯЛІКІМ ПАЧУЦЦЁМ ГУМАРУ ПАРТНЁР

28 верасня 2009 г., Гістарычная майстэрня, г. Мінск.

Я выступаю ў Гістарычнай майстэрні і расказваю пра Федэратыўную Рэспубліку Германіі і Трэці рэйх на зямлі ў Мінску, дзе немцы знішчылі гета. Выступаю з тэзісам, што тэмай Трэцяга рэйха ў Германіі займаліся з 1945 г. Крытычнае вывучэнне нацысцкага мінулага праходзіла пэўныя этапы і працягваецца цяпер, паколькі заўсёды выяўляліся і выяўляюцца новыя праявы дыктатуры. І гэты можна патлумачыць уздзеяннем комплекснага характару Трэцяга рэйха, веды пра які выступаюць незаменнымі пры даследаванні гісторыі гвалту. І не толькі ў рэйху, а за яго межамі – таксама ў Савецкім Саюзе – думаюць часта пра праявы такіх этапаў, чым цяпер займаюцца нямецкія даследчыкі. На справе паказваюць гэтыя новыя этапы, якую дынаміку атрымала крытычнае стаўленне да мінулага ў Федэратыўнай Рэспубліцы амаль адразу пасля вайны, а таксама як яно зноў і зноў разгортваецца.

Цягам майго дакладу з першага шэрага на мяне ўсе больш пагрозліва пазіраў адзін годны Спадар. І калі я завяршыў выступленне, ён злосна запярэчыў, што не верыць ніводнаму майму слову. Гэты быў для мяне выдат-

ны шанец, паколькі ў якасці адказу я трымаў у значнай меры практычна новы даклад і пры гэтым здолеў усё больш падрабязна і дыферэнцыявана абгрунтаваць. Але мяне зноў усе ўважліва слухалі, хоць такім чынам час маёй запланавай прамовы быў падвоены.

Пасля ў гэтым жа будынку на былой гетаўскай кухні ладзілася сяброўская вячэра. Спадар з суровым знешнім выглядам таксама быў там. Мне ціха прашапталі: «Гэта палкоўнік!», метрам далей чую: «Ён з'яўляецца прафесарам па крымінальным праве!», яшчэ далей чую: «Ён таксама прафесар гісторыі». Следствам сустрэчы стала дыскусія, якая цягнулася амаль да 4 гадзін раніцы. У выніку стала відавочным яго перакананне ў тым, што я не з'яўляюся «фашыстам». Заключнае слова спадара палкоўніка гучала так: «Раніцай у мяне да 12 гадзін будзе лекцыя. Давайце пабачымся на маёй кафедры ў 12 гадзін і 5 хвілін».

Мы прыйшлі ў вызначаны час. Адразу ж разгарнулася даволі гарачая дыскусія. Мы пажадалі працягнуць яе за часам абеду, на які хацелі яго запрасіць. Аднак было позна, паколькі была прызначана наступная сустрэча з дырэктарам Нацыянальнага архіва Беларусі спадаром Селяменевым. Палкоўнік Шаркоў кажа: «Я іду разам з вамі, паколькі ён мой добры сябра». Пры гэтым назіраў за намі цягам размовы, седзячы ў аддаленні. Я патлумачыў дырэктару даволі падрабязна і грунтоўна з выкарыстаннем розных тэрмінаў нашу просьбу аб магчымасці даследавання нямецкіх злачынстваў у дачыненні да інвалідаў ў Беларусі цягам вайны. Падчас маёй працяглай прамовы Шаркоў сядзеў моўчкі. Потым сказаў толькі адно слова: «Так!» Праз некаторы час ён рашуча наблізіўся да стоса папак на яго працоўным стале: гэты былі даведнікі па фондах архіва, якія для нас мелі асаблівае значэнне. Пры гэтым мы не забыліся спытаць, ці можам мы пазнаёміцца з гэтым не ў агульнай чытальнай зале.

Такім чынам мы атрымалі вось такі выдатны доступ да архіўных спраў у Беларусі, чым былі асабліва ўражаны. І гэта дало магчымасць стварыць цудоўныя абставіны для працы маладых даследчыкаў, але і весці вельмі блізкую, даволі прыязную і прадуктыўную сумесную работу: пад кіраўніцтвам Аляксандара Фрыдмана група пераўтварылася ў выдатны працоўны гурт! Да цяперашняга часу мы перакананы, што гэты стала добрым сігналам для кіраўніка архіва ў выніку прысутнасці Анатоля Шаркова: падчас працы ў архіве мы не сустрэлі аніякіх перашкод на нашым шляху.

З гэтага вырасла даволі глыбокае, вельмі адкрытае і глыбокае сяброўства з Анатолем Шарковым. Яго заўсёдны гумар праганяў любы страх, які ўзнікаў з розных сюжэтаў жахлівай гісторыі. Яго ўражлівая рашучасць садзейнічала таму, што мы толькі ад іншых даведваліся, якой адметнай зоркай ён быў у Савецкім Саюзе. Нямецкія ваенныя злачынствы мы бачылі паўсюдна. Але з ім, сынам аднаго з вядомых партызанскіх камандзіраў, мы маглі весці размову вельмі адкрыта і дзякуючы гэтаму даволі шмат чаму навучыліся ад яго.

Палкоўнік Шаркоў быў з намі на вялікай канферэнцыі, арганізаванай з удзелам розных краін на базе Сарбонскага ўніверсітэта, дзе мы разам з маёй калегай Мары-П'ер Рэй (Marie-Pierre Rey) і спецыялістамі з Савецкага Саюза прадстаўлялі наш праект. Мы прэзентавалі там нашу нямецкамоўную кнігу, у якой разам з іншымі даследчыкамі з Украіны, былой Савецкай краіны, Швецыі і Германіі здолелі прадставіць вынікі працы амаль на 600 старонках у форме асобных паведамленняў. Унёскам палкоўніка Шаркова стаў важны аналіз працэсаў над ваеннымі.

Калі я ў верасні 2016 г. разам з жонкай – французскім гісторыкам – зноў прыехаў у Мінск, Анатоль Шаркоў і спадарыня Алена Харашэвіч здолелі нам паказаць вялікую частку Беларусі цягам толькі трох дзён. Мы былі ўражаны маштабамі разбурэнняў пад час ваенных дзеянняў. У шматлікіх замках і цэрквах мы ўбачылі вялікае майстэрства беларускіх рэстаўратараў. Нас прыемна ўразілі тыя маштабныя аднаўленчыя работы ў беларускіх гарадах і вёсках у пасляваенныя гады. Мы пазнаёміліся з прыгожымі ландшафтамі – асабліва былі ўражаны знаходкай святой крыніцы ў канцы лясных сцяжынак, што зніклі. Мы ведалі, што любіў палкоўнік «Рэмі Мартэн» («Rémy Martin») і перадалі яму на тым месца з вялікім гонарам адну эксклюзіўную бутэльку – але палкоўнік меў рацыю: лепшы каньяк свету ёсць мясцовы беларускі самагон, які ён прывёз з сабой для нас!

З таго часу палкоўнік Шаркоў стаў для нас проста Анатолем!

*Райнар Худэман, доктар гісторыі, прафесар*
*Пер. з нямецкай мовы С. Я. Новікава*